# Новости

Общество

21.02.2025

## У БДУІР адбыліся святочныя мерапрыемствы да Свята адвагі і мужнасці

**21 лютага ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі прайшоў святочны канцэрт, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Таксама студэнты і курсанты універсітэта паўдзельнічалі ў агітпрабегу і ўшанавалі памяць на Вайсковых могілках.**

Традыцыйна напярэдадні аднаго з шанаваных дзяржаўных свят - Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Беларусі - у нашым універсітэце арганізоўваюцца яркія святочныя мерапрыемствы. Сёння ў актавай зале БДУІР адбыўся канцэрт, які ўшаноўвае абаронцаў Радзімы. Супрацоўнікі і студэнты ўніверсітэта прыгадалі гераічныя подзвігі продкаў і аддалі даніну іх высакароднасці і мужнасці, павіншавалі тых, хто сёння працягвае слаўныя традыцыі.

Кожны год гэтае свята нагадвае пра тое, як важна захоўваць мірнае неба над галавой і не забывацца на сувязь між пакаленняў. 23 лютага - вельмі важная дата для краіны, бо гэта традыцыі нашай Айчыны - ушаноўваць людзей, якія стаяць на абароне Радзімы.

*«Беларусы вытрывалі шмат, каб заслужыць права жыць у сваёй краіне. Сення нашы суайчыннікі, якія нясуць вайсковую службу, штодня ахоўваюць нашу Радзіму, гарантуюць мір у нашых дамах. Мы павінны ганарыцца сваімі абаронцамі і не забываць, што беларусы - народ-пераможца і абавязаны высока несці гэтае званне. Сёння я хачу ад усёй душы пажадаць вам моцнага здароўя, міру, дабрабыту! Са святам!»*, - адзначыў рэктар **Вадзім Богуш**.

Потым з віншаваннямі выступілі намеснік начальніка факультэта па вучэбнай і навуковай рабоце, першы намеснік начальніка, палкоўнік **Леанід Уцін** и ветэран узброеных сіл, удзельнік баявых дзеянняў у народнай рэспубліцы Ангола **Іван Кручок**.

Пасля віншаванняў прысутным падарылі яркія эмоцыі тэматычныя вакальныя і танцавальныя нумары канцэртнай праграмы.






23 ФЕВРАЛЯ
ДЕНЬ ЗАЩИТНИКОВ ОТЕЧЕСТВА
И ВООРУЖЕННЫХ СИЛ РЕСПУБЛИКИ
BSUIR


BSUIR


BSUIR


BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR







Гэтым жа днём курсанты БДУІР паўдзельнічалі ў мітынгу на Вайсковых

могілках, прысвечанаму Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, і ўсклалі кветкі.

Апрача таго,сёння адбыўся традыцыйны агітпрабег «Мінск-Хатынь-Дальва», прысвечаны не толькі Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, але і памяці ганаровага грамадзяніна Лагойскага раёна, які стаў адзіным сведкам Дальвінскай трагедыі, **Мікалая Гірыловіча**. Удзел прымала 11 навучэнцаў з універсітэта і радыётэхнічнага каледжу БДУІР.

Юным спартоўцам трэба было пераадолець дыстанцыю працягласцю каля 2 км. На фінішы ўсіх удзельнікаў чакала група падтрымкі ў піянерскіх гальштуках і гарачая гарбата з салодкім пачастункам. Дыпломы і каштоўныя падарункі атрымалі ўладальнікі найлепшых спартовых вынікаў з розных устаноў адукацыі. Не засталіся без увагі і самыя маленькія ўдзельнікі агітпрабегу. Для іх арганізатары падрыхтавалі сувеніры. Скончылася мерапрыемства ўскладаннем кветак і вянкоў ля падножжа скульптуры «Маці і дзіця» і на брацкай магіле.

«*Гэта быў неверагодны досвед, які я ніколі не забуду. Удзельнічаючы ў гэтым прабегу, я адчуў глыбокую сувязь з гісторыяй і павагу да ўсіх, хто змагаўся ў часы Другой Сусветнай вайны. Такія мерапрыемствы не даюць забыцца на нашу гісторыю, нашае мінулае. Яны безумоўна вельмі важныя, бо без ведання мінулага немагчыма пабудаваць добрую будучыню. Я лічу, што трэба праводзіць мерапрыемствы такога плану часцей*», - падкрэсліў уладальнік дыплома за І месца ў агітпрабегу, студэнт 1 курса ФКП **Аляксандр Стрэмаўс**.
Пасля прабегу бдуіраўцы наведалі музей мемарыяльнага комплексу «Хатынь».


БЕЛАРУСЬ
УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ
BSUIR


BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


15
13
14
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


74
89
90
88
72
77
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR







Падрыхтавана прэс-службай
Фота Андрэя Сіняўскага і Максіма Максака